# ULTIMATE X-MEN

ISSUE 16

СУСВЕТНЫ ТУР. ЧАСТКА 1

MARVEL

MILLAR
KUBERT
MIKI



MARVEL.COM

BY COMICS

СУЧАСНЫЯ ЛЮДЗІ-ІКС #16 (2001)
ПЕРАКЛАД І АФАРМЛЕННЕ:
COMICSBY

Мілар Куберт Майкі

ЛЭНДС ЭНД, ШАТЛАНДЫЯ:

Элайпаўлас Сцюарт Сміт Маччына Кесада Джэмас




ДАРЭЧЫ, ГЭТА НЕ НАША СПРАВА. ЗВЫЧАЙНЫЯ ПАЛІЦЭЙСКІЯ НЕ ПАВІННЫ І СУНУЦЦА Ў ТАКІЯ ІДЫЁТСКІЯ ГІСТОРЫІ.
MOOI

КАЛІ НАРВЕЖСКІ ХЛОПЧЫК СПРАБУЕ ПЕРАВЕЗЦІ ТРОХІ НАРКОТЫКАЎ, - ГЭТА АДНА СПРАВА, АЛЕ ГЭТАЕ СУДНА ПЛЫВЕ З ВОСТРАВА МУІР, РАБЯТЫ, І МНЕ ТАК ДОБРА ПЛАЦЯЦЬ, КАБ Я ПАЛЯВАЎ НА БЕГЛЫХ МУТАНТАЎ.
ЁН ТОЛЬКІ ДЗЕВЯТНАЦЦАЦІГАДОВЫ ПАДЛЕТАК. ЁН ЗАХВАРЭЎ, КАЛІ ЯМУ БЫЛО ТРЫНАЦЦАЦЬ. І АКРАМЯ ТАГО, НАС ПРАІНСТРУКТЫРЫВАЛІ. ШТО МОЖА ЗДАРЫЦЦА?

ДОКТАР МАКТАГЕРТ ЗАРАЗ У ЛЯКАРНІ. СКАЖЫЦЕ ЁЙ, ШТО ЭКІПАЖ, НА ЯКІ ЁН НАПАЎ, ЗНІШЧАНЫ.
ОЙ, БОЖАЧКІ!
АЛЕ ЯЕ ХЛОПЧЫКА НІДЗЕ НЯМА.



Я ТУТ, ПРЫТЫРАК! ХОЦЬ ТОЛЬКІ БОГУ ВЯДОМА, КОЛЬКІ Я ЯШЧЭ ЗМАГУ ПРАТРЫМАЦЦА Ў ГЭТЫМ НЯМОГЛЫМ ЦЕЛЕ!
СЯРЖАНТ! ХУТЧЭЙ! АДЗІН З ІХ ЯШЧЭ ЖЫВЫ!

БОЖА ЛІТАСЦІВЫ! ЁН УСЯЛІЎСЯ Ў ПРАФЕСАРА. АДЫДЗІЦЕ Ў БОК І ЗАКРЫЙЦЕ ВОЧЫ. НЕ ЗАБЫВАЙЦЕ ПРА ТОЕ, ШТО КАЗАЛА ДОКТАР!

СЛУХАЙ, ДЭВІД, БУДЗЬ РАЗУМНЫМ.
МЫ АБОДВА ВЕДАЕМ, ШТО ТЫ НЕ ПРАЦЯГНЕШ І 24 ГАДЗІН ЗА МЕЖАМІ ЛЯКАРНІ ТВАЕЙ МАЦІ. ТАМУ ДАВАЙ НЕ БУДЗЕМ УСКЛАДНЯЦЬ І БЕЗ ТАГО НЯПРОСТУЮ СІТУАЦЫЮ.

ЗА ГЭТЫЯ 24 ГАДЗІНЫ Я ПАСПЕЮ БОЛЬШ, ЧЫМ ТЫ І ТВАЕ СЯБРЫ, ТАЎСТАПУЗ.

ШТО?




СЯРЖАНТ!


BRAAAP


УЖО НЕ.




ДЗЕСЯЦЬ СУПРАЦЬ АДНАГО, ШТО Я ДАБЯРУСЯ ДА БЕРАГА СУХІМ.





THUNK!

ЁСЦЬ!


ПАБАЧЫМ, КОЛЬКІ ЗАРАЗ ПЛАЦЯЦЬ ВЯЛІКІМ, ТОЎСТЫМ ПАЛІЦЭЙСКІМ?


О, НЯ-ДРЭННА...




ЦЯПЕР МОЖНА І ПЕРАКУСІЦЬ.




ЛОНДАН. ДВУМА ДНЯМІ РАНЕЙ.

# ЛЮДЗІ-ІКС


De Blieck's Books
ШТОРМ, ТЫ ЧЫТАЛА КНІЖКУ ПРАФЕСАРА?





# СУСТВЕТНЫ ТУР

## частка першая




АДНАК МЫ ПАЕХАЛІ Ў ГЭТЫ ВАСЬМІТЫДНЁВЫ ТУР НЕ ДЛЯ ТАГО, КАБ РЭКЛАМАВАЦЬ «КОСМА», МІС МАНРО.


А ЧАСОПІС «ПІПЛ» НІКОЛІ Б НЕ ЗАПРАСІЎ НАС У ЛОНДАН. ВЕДАЕШ, Я ХАЦЕЛА СХАДЗІЦЬ ЗА ПАКУПКАМІ НА КАРНАБІ СТРЫТ З ТЫХ ЧАСОЎ, ЯК ПЕРШЫ РАЗ ПАГЛЯДЗЕЛА «ОСЦІНА ПАЎЭРСА».
А МНЕ БОЛЬШ ДА ДУШЫ ЎСЯЛЯКІЯ ЭКСКУРСІІ, МАРВЕЛ. НАПРЫКЛАД, БУКІНГЭМСКІ ПАЛАЦ ЦІ ГАЛЕРЭЯ МАДАМ ЦЮССО. УСЁ Ж ТАКІ ПАЦЕШНАЯ КРАІНА. ГЭТЫЯ АНГЛІЧАНЕ ТАК НЕДАРЭЧНА РАЗМАЎЛЯЮЦЬ...


О НЕ, ЛОНДАН – САМЫ ФАЙНЫ ГОРАД У СВЕЦЕ, ШТОРМ. ЛЮБЛЮ МЯСЦОВУЮ АДЗЕЖУ, КІНО І МУЗЫКУ. А ТЫ РАЗВАЖАЕШ ЯК АБЫВАЦЕЛЬ.


РАЗЛІЧВАЕШ НА ТОЕ, ШТО ЎСЁ ГЭТА РАМАНТЫЧНАЕ АСЯРОДДЗЕ СПРЫЯЕ ТАМУ, ШТО ДРЭННЫ ХЛОПЧЫК РАСАМАХА ЗНОЎ ЗАПАДЗЕ НА ЦЯБЕ, ДЖЫННІ?
ГЭТА НАВАТ НЕ СМЕШНА, АРАРО.


І ПОТЫМ, КАГО ЦІКАВІЦЬ РАСАМАХА, КАЛІ ЦЫКЛОП УЖО ГАТОВЫ НАБРАЦЦА СМЕЛАСЦІ. Я МІЛЬЁН РАЗОЎ КАЗАЛА ТАБЕ: Я РАДА, ШТО Ў АПОШНІ ЧАС ЁН УДЗЯЛЯЕ МНЕ ЎСЁ БОЛЬШ УВАГІ.

І КОЖНЫ РАЗ ГЭТА ГУЧЫЦЬ УСЁ МЕНШ ПЕРАКАНАЎЧА.


ПАСЛУХАЙ, НЕ ТАБЕ РАЗВАЖАЦЬ ПРА ЛЮБОЎНЫ ТРОХКУТНІК, КАЛІ МАЛЕНЬКІ СЯБР ТВАЙГО ХЛОПЦА – ЧАЛАВЕК-ЛЁД ХАВАЕ ГАЗЕТНЫЯ ВЫРАЗКІ З ТВАІМІ ФАТАЗДЫМКАМІ.
ВЕДАЕШ, МІЛАЯ, ПРАЗ ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ У НАШУ ШКОЛУ ПРЫЙДУЦЬ НОВЫЯ МАЛАДЫЯ І СТРОЙНЫЯ МУТАНТЫ. А МЫ ЎЖО БУДЗЕМ СТАРЫМІ І ВЫРОДЛІВЫМІ.


ТАМУ ДАВАЙ, АТРЫМЛІВАЙ ЗАВАЛЬНЕННЕ АД МУЖСКОЙ УВАГІ, ПАКУЛЬ МЫ АДЗІНЫЯ ДЗЯЎЧЫНЫ Ў КАМАНДЗЕ.
УАЎ!
ПАБАЧ! ЗВАР'ЯЦЕЛАЯ ДАМАЧКА З ПІСТАЛЕТАМ І ГАЛАЎНЫМ БОЛЕМ.


ВІДАЦЬ, МЫ ЗНАЙШЛІ, КІМ ЗАНЯЦЦА.

СОХА.

МАМ. АЛЕ Я Ж ІКС-МЭН. Я НЕ ПАВІНЕН ЕХАЦЬ ДАДОМУ НА АБЕД ТОЛЬКІ ТАМУ, ШТО СЁННЯ НЯДЗЕЛЯ.

ТАК, ТЫ – ІКС-МЭН, АЛЕ ГЭТА НЕ ЗНАЧЫЦЬ, ШТО ТЫ СТАЎ РАПТАМ СІРАТОЙ, БОБІ.

МЫ КАЗАЛІ ПРАФЕСАРУ, ШТО НЕ СУПРАЦЬ, КАЛІ ЁН БУДЗЕ НАВУЧАЦЬ ЦЯБЕ КІРАВАЦЬ ЧАЛАВЕКАМ-ІЛЬДОМ. АЛЕ МЫ НЕ ДАВАЛІ ДАЗВОЛ НА ТВОЁ СУСВЕТНЫ ТУР.

Daily Bugle
CAPTAIN AMERICA ALIVE??

МАМ, ХОПІЦЬ. ГЭТА ЎСЯГО ТОЛЬКІ АНГЛІЯ, ФРАНЦЫЯ, ГІСПАНІЯ, ІТАЛІЯ І, МАГЧЫМА, АЎСТРАЛІЯ. Я ВЕДАЮ, ШТО ПАВІНЕН БЫЎ РАНЕЙ ПАПЯРЭДЗІЦЬ ЦЯБЕ, АЛЕ Ж ТУТ НЯМА НІЧОГА НЕБЯСПЕЧНАГА.

ТЫ ВЕДАЕШ, У ЯКОЕ ДУРНОЕ СТАНОВІШЧА ТЫ МЯНЕ СТАВІШ ПЕРАД МАІМІ СЯБРАМІ?

ДАВАЙ Я ПАГУТАРУ З ТВАЕЙ МАТУЛЯЙ, ЛЯДЗЕЦ.

МІСІС ДРЭЙК? ГЭТА РАСАМАХА, ВАШ СЫН ЗАРАЗ НА ШКОЛЬНАЙ ЭКСКУРСІІ Ў ЛОНДАНЕ. І Я ХАЧУ ВАС ЗАПЭЎНІЦЬ, ШТО МЫ З КАЛОСАМ ПАКЛАПАЦІМСЯ АБ ІМ...

ТАК. ТАК, СПАДАРЫНЯ. КАЛОС – ГЭТА ТАКІ ВЯЛІКІ ПРЫВАБНЫ ХЛОПЕЦ, ЯКІ РАНЕЙ ПРАЦАВАЎ НА РУСКУЮ МАФІЮ...










ТАК, УСЁ ПАЙШЛО НЕ ТАК ДОБРА, ЯК МЫ ПЛАНАВАЛІ.

ВЯЛІКІ ДЗЯКУЙ, РАСАМАХА. ЦЯПЕР МНЕ ГАМОН. ТЫ ГЭТА РАЗУМЕЕШ? ЗАБУДЗЬЦЕ ПРА МАГНЕТА І ЯГО БРАТЭРСТВЕ МУТАНТАЎ. МАЯ МАТУЛЯ МЯНЕ Ў СНЯЖОК СКРОШЫЦЬ.

КАЛІ ТЫ ВЕРНЕШСЯ ДАДОМУ, ЯНА БУДЗЕ ТАК РАДА, ШТО ВЫКАНАЕ ЛЮБЫ ТВОЙ КАПРЫЗ...

І АКРАМЯ ТАГО, ТЫ Ж НЕ ЗБІРАЕШСЯ ЗАСТАЎЛЯЦЬ СВОЙ МАБІЛЬНІК У ГЭТЫМ НАРКАМАНСКІМ ПРЫТОНЕ? ЦІ ТЫ ХОЧАШ ЗНІШЧЫЦЬ НАШАЕ АЛІБІ?




КАЛІ МЫ ЗАТРЫМАЕМ ТЫХ ХЛОПЦАЎ З МАЙЯМІ, ГЭТА БУДЗЕ НАШ САМЫ ВЯЛІКІ ПОСПЕХ ЗА МЕСЯЦ. І Я НЕ ЗБІРАЮСЯ СТРАЧВАЦЬ НАШ ШАНЕЦ АБЫЙСЦІ, НАРЭШЦЕ, ЦЫКЛОПА І ЗВЕРА.
ТРЫ РАЗЫ ЗАПАР ЯНЫ ПЕРААДОЛЬВАЛІ НАС У СПРЭЧЦЫ, АЛЕ Я БОЛЬШ НЕ ДАЗВОЛЮ ЗАСТАЎЛЯЦЬ СЯБЕ Ў ДУРНЯХ. ЗГОДЗЕН, КАЛОС?


ТАК.
ЦЯПЕР СЛУХАЙЦЕ ЎВАЖЛІВА, ВЫ РАЗМАЎЛЯЕЦЕ З ПРАФЕСІЯНАЛАМ. СПАДАРЫ, МЫ ТОЛЬКІ ШТО ЎСТУПІЛІ Ў САКРЭТНУЮ АРГАНІЗАЦЫІЮ, ЯКОЙ КІРУЕ РАСАМАХА.
БОЖА.
ГЭТЫЯ КАЛХАЗАНСКІЯ АМЕРЫКАНЦЫ СПРАБУЮЦЬ ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА СЯБЕ ЎВАГУ!

ЛЕЙСЕСТЭР СКВЕР.

ШТО СКАЖАШ ПРА ТУЮ ЖАНЧЫНУ?

НІЧОГА КАТАСТРАФІЧНАГА, ЦЫКЛОП, КАЛІ МЫ ВЫРАШЫЛІ СЁННЯ ВЫРАТАВАЦЬ КАГОСЬЦІ АД СМЕРЦІ, Я ХАЧУ ЗНАЙСЦІ САПРАЎДЫ БЕЗНАДЗЕЙНЫ ВЫПАДАК І ВЫРАШЫЦЬ ЯГО.

ДОБРА, А ШТО НАКОНТ ТАГО ХЛОПЦА Ў ВАЙСКОВЫХ ПАРТКАХ І КАШУЛЯЙ З ЭМБЛЕМАЙ? ЁН ВЫГЛЯДАЕ ТАК, БЫЦЦАМ ПРАЗ 10 ХВІЛІН СКОНЧЫЦЬ САМАГУБСТВАМ.

ТЫ СУР'ЁЗНА?
Я НЕ ХАЧУ МАРУДЗІЦЬ НАСТУПНЫЯ ДВА ДНІ, КАБ АДШУКВАЦЬ ЁЛУПНЯЎ, ЯКІЯ НЕ НАВУЧЫЛІСЯ АПРАНАЦЦА.

ДОБРА, ЗВЕР. ТАБЕ ВЫРАШАЦЬ. У ЦЯБЕ, ВІДАЦЬ, ЁСЦЬ СВАЕ МЕТАДЫ Ў ПОШУКУ ПРАЕКТА. ЯКІ ПРЫНЯСЕ НАМ «ПЯЦЁРКУ З ПЛЮСАМ».

ПРА ЛЮДЗЕЙ МОЖНА МНОГА СКАЗАЦЬ ПА ІХ ЗНЕШНАСЦІ.

ШЧЫРА КАЖУЧЫ, МІСТАР САМЕРС, НАШ СЁННЯШНІ «ПРАЕКТ» УЖО ЗНАЙШОЎ НАС САМ.

ГАТЭЛЬ РЫТЦ.

ТАКІМ ЧЫНАМ, СЯБРЫ, 48 ГАДЗІН, ЯКІЯ Я ВАМ ПРАПАНАВАЎ НА ВЫКАНАННЕ ЗАДАННЯ, ЗАКОНЧЫЛІСЯ. ДАВАЙЦЕ ЗАЗІРНЕМ У РАНІШНІЯ ГАЗЕТЫ І ПАГЛЯДЗІМ, ШТО ПІША ПРА ВАШЫЯ ПОДВІГІ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПРЭСА?

ШТО ГЭТА? ВЫ САПРАЎДЫ ХАЦІЦЕ ПРАПАНАВАЦЬ НАМ ГІСТОРЫЮ ПРА ТОЕ, ЯК ПАБІЛІ НЕКАЛЬКІХ РАБАЎНІКОЎ?

РАБЯТЫ, ВАС ТРОЙЧЫ ПРЫЗНАВАЛІ ЛЕПШЫМІ Ў КЛАСЕ, АЛЕ ШТОСЬЦІ ПАДКАЗВАЕ МНЕ, ШТО Ў ГЭТЫ РАЗ Я СА СВАЁЙ ПАПЛЕЧНІЦАЙ ПЕРАХАПІЛА Ў ВАС СУКОЛКУ ЛІДЭРА.

НЕ АБАВЯЗКОВА, ШТОРМ...

КАНЕШНЕ, МЯРКУЮЧЫ ПА АРТЫКУЛУ Ў РАНІШНІХ ГАЗЕТАХ, МОЖНА ЎЯВІЦЬ, ШТО ВАС ЧАСКАЮЦЬ ДОБРЫЯ АДЗНАКІ, АЛЕ БАЮСЯ, СЁННЯ АСАБЛІВЫ ВЫПАДАК.

СКОТ САМЕРС І ГЕНРЫ МАКОЙ ЗНОЎ АКАЗАЛІСЯ ЛЕПШЫМІ, УСЕ АСТАТНІЯ ДАВЕДАЮЦЦА ПРА ВЫНІКІ СВАЁЙ РАБОТЫ ТЭЛЕПАТЫЧНА.

ШТО?

МЯНЕ МАЛА ЦІКАВЯЦЬ АДЗНАКІ І ЎСЁ ТАКОЕ, АЛЕ З ЯКІХ ЧАСОЎ БОЙКА З НЕКАЛЬКІМІ ПАНКАМІ АЦЭНЬВАЕЦЦА ВЫШЭЙ, ЧЫМ ПЕРАШКОДА ЗАМОВЫ ПА ПРОДАЖУ ГЕРАІНА НА МІЛЬЁНЫ ДАЛЯРАЎ?


БО Ў ЗАПАЛЕ ТЫ ПАКАЛЕЧЫЎ, ЗАБІЎ І ПАКІНУЎ ВЫРОДЛІВЫМІ 20 ЧАЛАВЕК, РАСАМАХА.

Я ЗАСНАВАЎ ШКОЛУ НЕ ДЛЯ ТАГО, КАБ СТВАРЫЦЬ АРМІЮ ЗАБОЙЦ. ЯК Я МАГУ ЕЗДЗІЦЬ ПА СВЕТУ І СПАДЗЯВАЦЦА НА РАЗУМЕННЕ, КАЛІ МАЕ ВУЧНІ ВЯДУЦЬ СЯБЕ ЯК АЎСТРАЛАПІТЭКІ?

Я НЕ ЛЮБЛЮ ТУРМЫ, НЕ ЛЮБЛЮ КРЫМІНАЛЬНЫЯ ПАКАРАННІ, І МНЕ НЕ ПАДАБАЕЦЦА, КАЛІ МУТАНТЫ КІДАЮЦЬ КАМЕННІ Ў ВЫПАДКОВЫХ МІНАКОЎ.

АЛЕ ГЭТЫЯ ІРЛАНДЦЫ ХАЦЕЛІ ПАДАРВАЦЬ СУПЕРМАРКЕТ У ЦЭНТРЫ ЛОНДАНА, ПРАФЕСАР.


МЫ СА ШТОРМАМ ПРАДУХІЛІЛІ ТЭРАРЫСТЫЧНЫ АКТ, ПРАФЕСАР. САМАЯ ПАПУЛЯРНАЯ ГАЗЕТА БРЫТАНІІ НАДРУКАВАЛА ПРА НАС НА ПЕРШАЙ, ДРУГОЙ І ТРЭЦЯЙ СТАРОНКАХ.
THE SUN
X-BABES SMASH REAL IRA PLOT


МЫ З РАБЯТАМІ ЗНІШЧЫЛІ МІЖНАРОДНЫ НАРКА-СІНДЫКАТ, ЯКІ ДЗЕЙНІЧАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ АД МАЙЯМІ ДА РУМЫНІІ, ПРАФЕСАР. ДРУГАЯ ПА ПАПУЛЯРНАСЦІ ГАЗЕТА БРЫТАНІІ, СТАРОНКІ ТРЫ, ЧАТЫРЫ І ПЯЦЬ.
DAILY MIRROR
X MEN BUST LOND HEROIN NETWORK


МЫ З ЦЫКЛОПАМ ЗЛАДЗІЛІ З ЖАЛАСНАЙ БАНДАЙ ХУЛІГАНАЎ. НАЖАЛЬ, ПРА НАС НЕ ПІСАЛІ Ў ГАЗЕТАХ, АЛЕ Я ЗМОГ РАЗГАДАВАЦЬ СКРЫЖАВАНКУ З «ТАЙМС» ЗА РЭКОРДНА КАРОТКІ ТЭРМІН.


ВАС ПРАСІЛІ ВЫРАТАВАЦЬ ЧАЛАВЕЧЫЯ ЖЫЦЦІ. А НЕ ВЕСЦІ СЯБЕ, ЯК ГЕРОІ БАЯВІКОЎ.
А ШТО ГЕНРЫ СА СКОТАМ ЗРАБІЛІ ТАКОГА ПРЫКМЕТНАГА? ЗАБІЛІ ДВА ДНІ НА ТОЕ, КАБ НАВУЧЫЦЬ ГЭТЫХ ДРОБНЫХ ЗЛОДЗЕЯЎ, ЯК ЖЫЦЬ, І ЗНАЙСЦІ ІМ ДОБРУЮ ПРАЦУ?


ТАК. ЗА ВЫКЛЮЧЭННЕМ ДВУХ ХЛОПЦАЎ, ЯКІХ МЫ ЎЗЯЛІ ПАД РОСПІС. АЛЕ ЗНАЁМЫЯ ПРАФЕСАРА З РАЗВЕДВАЛЬНАЙ СЛУЖБЫ АБЯЦАЛІ ПАШУКАЦЬ ІМ МЕСЦА, ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ЯНЫ ВЫЙДУЦЬ НА СВАБОДУ.
ВЫ, ПЭЎНА, ЖАРТУЕЦЕ...


СКАЖЫЦЕ, ГЭТА Ж НЕ СТАНЕ НАШЫМ НОВЫМ ПРАДМЕТАМ? Я ХАЖУ НА ЗАНЯТКІ НЕ ДЛЯ ТАГО, КАБ З МЯНЕ РАБІЛІ ДУРАЦКАГА САЦПРАЦАЎНІКА.


ЯНЫ ТАКСАМА ЧАСТКА ЧАЛАВЕЦТВА, ЧЫЮ ПАВАГУ МЫ ІМКНЕМСЯ АТРЫМАЦЬ.


ЗАРАЗ НАША ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА – ЗАВАЯВАЦЬ ДАВЕР ЧАЛАВЕЧАЙ РАСЫ. НА ТРЭЦІМ ЭТАПЕ МЫ БУДЗЕМ ПРАПАНОЎВАЦЬ МІРНЫЯ ВАРЫЯНТЫ Ў ВЫРАШЭННІ ЗВЫЧАЙНЫХ ЧАЛАВЕЧЫХ ПРАБЛЕМ.


НЕ ДАВАЙЦЕ ІМ НОВЫХ ПРЫЧЫН, КАБ НЕНАВІДЗЕЦЬ ВАС.



ПРАФЕСАР ХАЎЕР, АД ІМЯ НАШЫХ СЛУХАЧОЎ, ХАЧУ ПАДЗЯКАВАЦЬ ВАС ЗА ЗАХАПЛЯЛЬНУЮ ЛЕКЦЫЮ. СПАДЗЯЮСЯ, У ВАС З'ЯВІЦЦА ШМАТ ПРЫХІЛЬНІКАЎ, СЭР.

У КАГО-НЕБУДЗЬ З ВАС ЁСЦЬ ПЫТАННІ ДА ЛІДАРА «ЛЮДЗЕЙ ІКС?»



ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ПРАФЕСАР. МНЕ ВЕЛЬМІ ЦІКАВА, ЯК ФІНАНСУЮЦЦА АПЕРАЦЫІ «ЛЮДЗЕЙ ІКС». ГЭТА ПРАЎДА, ШТО ВЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЕЦЕ ТЭЛЕПАТЫЮ, КАБ МАНІПУЛІРАВАЦЬ АКЦЫЯМІ І КАШТОЎНЫМІ ПАПЕРАМІ?



НЕ, УСЁ АБСТАЛЯВАННЕ, САМАЛЁТЫ І МАЯ САКРЭТНАЯ ШКОЛА Ў НЮ-ЁРКУ БЫЛІ СТВОРАНЫ НА МАЕ ЎЛАСНЫЯ СРОДКІ.

ТАК, Я ГУЛЯЮ НА ФОНДАВАЙ БІРЖЫ, АЛЕ Я НІКОЛЕ НЕ ДАЗВАЛЯЎ САБЕ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ СВАЕ ЗДОЛЬНАСЦІ Ў СВАІХ ФІНАНСАВЫХ ІНТАРЭСАХ.



ВЫ САПРАЎДЫ ЛІЧЫЦЕ, ШТО ІКС-МЭНАМІ МОГУЦЬ СТАЦЬ НЕ ТОЛЬКІ МУТАНТЫ?




КАНЕШНЕ, ГАЛОЎНАЯ ІДЭЯ КНІГІ Ў ТЫМ, ШТО ЛЮДЗІ І МУТАНТЫ ПАВІННЫ ЖЫЦЬ У ГАРМОНІІ.

РАЗУМНЫ ЧАЛАВЕК, НАВАТ КАЛІ Ў ЯГО НЯМА ГЕНА «ФАКТАР ІКС», ЦАЛКАМ МОЖА ДАЛУЧЫЦЦА ДА НАС І ПАСПРАБАВАЦЬ ЗРАБІЦЬ СВЕТ ЛЕПШЫМ.




ЯК ВЫ ПРАКАМЕНЦІРУЕЦЕ ЧУТКІ ПРА ТОЕ, ШТО ВЫ ЗАСНАВАЛІ ДРУГУЮ ШКОЛУ, НА ВОСТРАВЕ КАЛЯ ЎЗБЯРЭЖЖА ЕЎРОПЫ. КАЖУЦЬ, НАВАТ ВАШЫЯ ВУЧНІ НЕ ВЕДАЮЦЬ ПРА ГЭТА?

ЦІ ПРАЎДА ТОЕ, ШТО КАЖУЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ? БЫЦЦАМ У СВАЁЙ ШКОЛЕ ВЫ ТРЭНІРУЕЦЕ НАЙБОЛЬШ НЕБЯСПЕЧНЫХ ДЛЯ ГРАМАДСТВА МУТАНТАЎ?



НА ШЧАСЦЕ, Я НЕ МАЮ ЗВЫЧКІ РЭАГІРАВАЦЬ НА ПЛЁТКІ З ІНТЭРНЭТА, МІС. НАСТУПНАЕ ПЫТАННЕ, КАЛІ ЛАСКА.



ПРАФЕСАР ХАЎЕР, ТОЙ ПРЫЁМ, ЯКІ АКАЗАЎ ВАМ НАТОЎП ПРЫ ЎВАХОДЗЕ Ў БУДЫНАК, ЁН НЕ КРЫЎДЗІЦЬ ВАС?











ПРАФЕСАР?

ПРАБАЧЦЕ, ПРАФЕСАР?
МНЕ ПЕРАПЫТАЦЬ ВАС?

НЕ, У ГЭТЫМ НЯМА
НЕАБХОДНАСЦІ.

Я ВУЧЫЎ СВАІХ СТУДЭНТАЎ
СПАКОЙНА ПЕРАЖЫВАЦЬ
КРЫЎДЫ. АЛЕ ДА НЯНАВІСЦІ
НЕМАГЧЫМА ПРЫВЫКНУЦЬ.

КАЛІ ЛАСКА,
НАСТУПНАЕ ПЫТАННЕ.


ДЗЕ ЁН?


УШОЎ. АДМІНІСТРАТАР СКАЗАЎ, ШТО КАЛОС ВЫЙШАЎ У ТРЫ ГАДЗІНЫ НОЧЧУ. ЁН ВЫКЛІКАЎ ТАКСІ І ЎЕХАЎ У АЭРАПОРТ З НЕВЯДОМЫМІ.
ТЫ Ж НЕ ДУМАЕШ, ШТО ЁН МОГ ПЕРАЙСЦІ НА ІНШЫ БОК? МУЖЧЫНЫ І ЖАНЧЫНЫ.
НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ, ДЖЫННІ. ПАВЕР МНЕ, Я ЎМЕЮ РАЗЛІЧАЦЬ ДАБРО І ЗЛО. ПЁРТ РАСПУЦІН НЕ З ТЫХ, ХТО МОЖА ЗДРАДЗІЦЬ СВАІМ СЯБРАМ.


МНЕ НЕ ПАДАБАЕЦЦА, ЯК ТЫ ГЛЯДЗІШ НА МЯНЕ, КАЛІ КАЖАШ ГЭТА, РАСАМАХА.
ШТО ВЫ СКАЖАЦЕ, ПРАФЕСАР? КАЛОС БЫЎ ВЕЛЬМІ ЦІХІМ АПОШНІ ТЫДЗЕНЬ. ВЫ ДУМАЕЦЕ, ЁН УШОЎ З КАМАНДЫ ЦІ ЗРАБІЎ НЕШТА ГОРШАЕ?
ПРАФЕСАР?
212 555 431-
MCTAGG
ПРАБАЧЦЕ, МНЕ ТРЭБА АДЫСЦІ.

ВОСТРАЎ МУІР. ШАТЛАНДЫЯ.

Я СЛУХАЮ ЦЯБЕ, МОЙРА. У ЧЫМ СПРАВА?

У ЧЫМ СПРАВА? НАВАТ НЕ ВЕДАЮ, З ЧАГО ПАЧАЦЬ.

МАЯ ЛЯКАРНЯ РАЗБУРАНА, ПАЛОВА СУПРАЦОЎНІКАЎ ЗАГІНУЛА. АГЕНТЫ БРАДОК І ТОМАЗ З БРЫТАНСКАЙ ФІЛІІ «АБАРОНЫ» ТОЛЬКІ ШТО ЎЗЯЛІ МЯНЕ ПАД ХАТНІ АРЫШТ, І НЕ АДПУСЦЯЦЬ, ПАКУЛЬ ТЫ НЕ ПРЫЕДЗЕШ, ЧАРЛІ.

ШТО НАМ ЦЯПЕР РАБІЦЬ? ЁН МОЖА БЫЦЬ ДЗЕ ЗАЎГОДНА.

ПРА ШТО ТЫ ГАВОРЫШ, МОЙРА? ГЭТА З-ЗА ДЭВІДА?

КАНЕШНЕ, З-ЗА ДЭВІДА. АБ КІМ БЫ Я ЯШЧЭ СТАЛА Б ГАВАРЫЦЬ, НЯШЧАСНЫ ІДЫЁТ!

НАШ СЫН УЦЁК!

ПРАЦЯГ БУДЗЕ...